Шабанава А.Ю., студ гр. 108 а ФКіСКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Пагоцкая А.В.,
выкладчык

# АСАБЛІВАСЦІ АРХІТЭКТУРЫ МІЁРСКАГА РАЁНА

Міёрскі раён размяшчаецца на паўночным захадзе ад Віцебскай вобласці. У раёне знаходзяцца архітэктурныя збудаванні, якія адносяцца да розных эпох і стылей. Кожнае з іх захоўвае шмат цікаўных і каштоўных гісторый. Храмы з’яўляюцца такімі сведкамі, якія могуць распавядаць не толькі пра гісторыю Міёршчыны, але і пра змяненні дзяржаўнай палітыкі на тэрыторыі ўсёй беларускай зямлі, а таксама за яе межамі.

Вельмі шырока на тэрыторыі раёна прадстаўлена драўлянае дойлідства. Самым даўнім архітэктурным помнікам Міершчыны з̓яўляецца *Троіцкі касцёл у в. Новы Пагост* [1]. Вядома, што ў 1654 годзе падчас вайны з Маскоўскай дзяржавай ён быў спалены, але ўжо праз два гады адбудаваны. Зараз гэта невялікі будынак на мураваным падмурку з дзвюма вежамі і жалезнымі крыжамі.

З дрэва ў 1774 г. была пабудавана *Троіцкая царква ў в. Лявонпаль*. Спачатку яна была дзвюхвежавая, пазней з паўднёвага боку ад увахода, з’явілася двух'ярусная званіца. Кампазіцыя царквы двухчасткавая: асноўны прамавугольны ў плане аб’ём і пяцігранная апсіда з бакавымі прыбудоўкамі. Сцены царквы брусчатыя, звонку вертыкальна ашаляваны дошкамі**,** а унутры – гарызантальна [3].

Да шэдэўраў драўлянага дойлідства Міёршчыны можна таксама аднесці: *царкву ў в. Галомысла* (другая палова XIX ст.); к*асцёл Сэрца Ісуса ў в. Перабродзе; Троіцкую царкву ў в. Кублішчына* (пач. XX ст.); *Пакроўскую царкву ў в. Сцяфанполле* (сярэдзіна XIX ст., перабудавана ў пачатку XX ст.);*Успенскую (стараверскую) царкву ў в. Ніўнікі* (пач. XX ст.) [3].

Бльш шырока на тэрыторыі раёна прадстаўлена мураванае дойлідства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*У* 1773 г. быў пабудаваны ў стылі барока *касцёл Бязгрэшнага Зачацця (касцёл францысканцаў) у г. Дзісна.* Аднак ён меў шэраг асаблівасцей, якія не характэрныя для гэтага стылю: адзін неф, нягледзячы на даволі ўнушальныя памеры (35 м у даўжыню і 19 м у шырыню). На фасадах касцёла, збудаванага з чырвонай цэглы, атынкаваны былі ні толькі пілястры, а і цокаль, карнізы і налічнікі вокнаў. Тынкоўка пакрывала галоўны фасад, упрыгожаны высокім барочным франтонам. Храм меў магутныя паўтарамятровыя сцены і вузкія вокны-байніцы над апсідай і дзве вінтавыя лесвіцы. Тры невялікіх акна, якія размешчаны былі на ўзроўні падлогі ў кожным з бакавых фасадаў, нагадваюць праёмы ў крапасной сцяне для стральбы з гармат. На жаль, ён захаваўся не поўнасцю. У 1991 годзе стараннямі прыхаджан пачалося аднаўленне касцела. Зараз ён дзейнічае.

У сярэдзіне XIX ст. пабудавана невялікая прамавугольная *царква ў в. Ідолта*. Накрыта двухсхільным дахам з трохвугольным франтонам з боку галоўнага паўднёвага фасада. Сцены расчлянёны пілястрамі і апяразаны зверху фрызам з трыгліфамі. Над франтонам узведзена квадратная ў плане драўляная вежа. Сцены гладка атынкаваныя. У яе абрысах праявіўся стыль класіцызм. У першай палавіне XX ст. у *в. Ідолта* быў пабудаваны аднавежавы прамавугольны ў плане *касцёл Бязгрэшнага Зачацця*. Квадратная ў плане вежа асіметрычна прыбудавана да галоўнага фасада. Фасады храма падзелены на два ярусы. Спалучэнне камня-валуна і белай цэглы надаюць будынку фактурную і каляровую выразнасць [3, 5].

*Успенскі касцёл у г. Міёры* – адзіны помнік неагатычнага стылю ў раёне – пабудаваны ў 1907 г. з чырвонай цэглы. Для яго характэрны: трохнефавая кампазіцыя, ступенчатыя контрфорсы, стральчатыя аконныя праёмы, акно-ружа. Трох'ярусныя вежы завершаны высокімі пілямі, раскрапаваны вузкімі нішамі. Вежа-ліхтар завяршае цэнтральны шчыт. Нефы перакрыты стральчатымі скляпеннямі.

Тэрыторыю Міёрскага раёна насялялі прадстаўнікі розных канфесій. Праваслаўная вера была найбольш распаўсюджанай ў раёне. Аб гэтым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сведчыць вялікая колькасць архітэктурных помнікаў псеўдарускага стылю: *Мікалаеўская царква ў в. Калінавая* (пабудаваная ў канцы XIX ст. з цэглы.); *Мікалаеўская царква ў в. Новы Пагост* [2] (пабудавана ў другой палове XIX ст. з бутавага каменю і цэглы); цагляная *царква Адзігітрыі ў г. Дзісна* (канец XIX ст.); *Мікалаёўская царква ў в. Узмёны* (другая палова XIX ст., цагляная); *Крыжаўзвіжанская царква ў в. Цвеціна* (пабудавана ў 1864 – 1867 гг.); *Мікалаёўская царква ў в. Чэрасы* (пабудавана ў другой палове XIX ст. з цэглы); *Праабражэнская царква ў в. Язна* ( канец XIX – пачатак XX ст.) [3, 5].

Для ўсіх гэтых пабудоў характэрна шмат’ярусная аб’ёмна-прасторавая кампазіцыя, якая складаецца з шатровай званіцы, бабінца, асноўнага аб’ёму і апсіды. Асноўны аб’ём па праваслаўнай традыцыі часта завершаны цыбулепадобным купалам. У дэкаратыўнай апрацоўцы фасадаў выкарастаны формы старажытнарускага культавага дойлідства – какошнікі, кілепадобныя аркі.

Асобную старонку ў гісторыі архітэктуры Міёршчыны займаюць <u>сядзібы</u>:

*Сядзіба ў в. Дзедзіна* (сфарміравана ў 1810 – 20 гг.) уключае сядзібны дом (перад ім часткова захаваўся пейзажны парк з сажалкай) і гаспадарчыя будынкі з бутавага каменю. У цэнтры галоўнага фасада чатырохкалонны порцік з трохвугольным франтонам. У распрацоўцы фасадаў выкарыстаны пілястры, прафіляваныя карнізы. Інтэр'ер будынка захаваў сляды былых камінаў, элементы дэкору ў неагатычным стылі [3, 4].

*Сядзіба ў в. Лявонпаль* (створана ў другой палове XVIII – пачатку XIX ст.) Сядзіба ўключае дом, пейзажны парк, гаспадарчыя будынкі. На галоўнай планіровачнай восі была цэнтральная ўязная брама, пабудаваная ў пачатку XIX ст. у стылі класіцызму (не зберагласся). Захаваліся мураваныя гаспадарчыя будынкі. Сядзібны дом пабудаваны ў 1750 г. з цэглы ў стылі барока. У 1831 г. часткова разбураны, у 1898 – 1901 гг. аднаўлены ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

першапачатковым выглядзе. У 1919 г. анфіладная сістэма планіроўкі дома заменена калідорнай [3,4].

*Сядзіба ў в. Каменполл*е (сфарміравана ў канцы XIX – пачатку XX ст.) уключае дом, гаспадарчыя будынкі, парк. У 1873 г. у паўднёвай частцы парку пабудаваны цагляны сядзібны дом – аднапавярховы прамавугольны ў плане. Планіроўка калідорнага тыпу. Захаваліся гаспадарчыя пабудовы: драўляная лядоўня (1873 г.), будынак стайні (1907 г.) і кузня (1907 г.) [3, 4].

У наш час архітэктурныя традыцыі захоўваюцца. Аб гэтым сведчыць, пабудаваны ўжо пасля 1990 г., *касцёл Дзевы Марыі Фацімскай у в. Павяцце*.

Такім чынам на тэрыторыі Міёршчыны праявілі сябе ўсе асноўныя архітэктурныя напрамкі: барока, класіцызм, псеўдарускі стыль, неаготыка і інш. На жаль, сёння мы бачым амаль палову архітэктурных збудаванняў. Шмат іх было знішчана на працягу войн, некаторыя былі разбураныя ці перабудаваныя.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Хахлоў, А. Старадаўні касцёл / А. Хахлоў // Сцяг працы. – 2000. – 17 октября.

2. Касцёл у Новым Пагосце. Па даследваннях сяброў гуртка “Арганаўты мінулага” пад кіраўніцтвам В.А. Ермалёнка // Міёрскія навіны. – 2003. – 23 декабря.

3. Кулагін А.М. Эклектыка. Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст. / А.М. Кулагін. – Мінск: Ураджай, 2000. – 302 с.

4. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Міёрскага раёна. – Мінск: Беларуская навука, 1998 . – 630 с.; іл.

5. Миорщина: Мгновения прошлого и настоящего. / Л.А. Мателенок; фото О.В. Молодечкина, Л.А. Мателенка. – Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2006. – 40 с.: фото.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ